ПРАКТЫКА ІДЭАЛАГІЧНЫХ ЗВЕННЯЎ

СЛЕДАМ ЗА ПАДЗЕЯМІ

Калі наведаеш Шаршунскую бібліятэку, то заўсёды ўвагу прыцягвае штосьці новае ў афармленні нагляднай агітацыі: кніжная выстаўка ці тэматычная паліца, бібліятэчны плакат ці стэнд. Масавыя мерапрыемствы: гутаркі, дыспуты, агляд літаратуры, вечары пытанняў і адказаў тут таксама праходзяць своеасабліва, цікава.

Днямі я зноў наведаў бібліятэку. І зноў заўважыў змены. Абнавілася наглядная агітацыя, якая стала больш змястоўнай, кніжны фонд папоўніўся новай літаратурай на прамысловую і сельскагаспадарчую тэматыку. Афармлены кніжныя выстаўкі «КПСС — натхняльнік і арганізатар працоўных перамог савецкага народа», «Зямля, хлеб, людзі», «Подзвіг народа бессмяротны», «У святле фарбаў, мелодый, слова». Ёсць тут каляндар працоўнай славы, папка газетных выразак «Саўгас «Савецкі» у адзінаццатай пяцігодцы» і шмат іншага цікавага наглядальнага матэрыялу, які можна выкарыстаць ідэалагічным работнікам у сваёй практычнай дзейнасці. Бібліятэка актыўна вядзе прапаганду гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда КПБ, матэрыялаў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС. Напрыклад, выстаўка «Зямля, хлеб, людзі» мае наступныя раздзелы: «Курс КПСС — на ўздым сельскай гаспадаркі», «Сельскай гаспадарцы — сучасную тэхніку», «Імі ганарыцца краіна». На кніжных паліцах выстаўкі «КПСС — натхняльнік і арганізатар працоўных перамог савецкага народа» размясцілася літаратура аб знешняй і ўнутранай палітыцы нашай партыі і ўрада, кнігі аб дасягненнях савецкіх людзей у народнай гаспадарцы, аб уздыме эканомікі, народнага дабрабыту, сацыялістычным ладзе жыцця.

Кідаецца ў вочы самая вялікая па змесце выстаўка «Подзвіг народа бессмяротны». Экспазіцыя размясцілася на двух сталажах і прадстаўлена раздзеламі «Ніхто не забыты, нішто не забыта», «Беларусь партызанская» і інш. Тут у асноўным сабраны матэрыял па краязнаўству, з якога даведваешся аб гераічнай барацьбе савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, аб ратных і працоўных буднях аднавяскоўцаў. У апошні час Шаршунская бібліятэка вядзе вялікую работу па краязнаўству. Сабрана шмат ужо новага аб партызанскай брыгадзе «Штурмавая», якая дзейнічала ў гады вайны на тэрыторыі Рагаўскога сельсавета, аб мясцовых жыхарах, якія змагаліся з ворагам. Аб гэтых людзях расказваюць кнігі Р. Мачульскага «Старонкі бессмяроцця», «Гавораць загінуўшыя героі» і іншыя.

Прыцягваюць увагу таксама і альбомы з каштоўным гістарычным матэрыялам, маляўніча афармленыя, ілюстраваныя фотаздымкамі. Адзін з іх прысвечаны жыццёваму шляху і баявому подзвігу нашага земляка, генерала М. К. Пуцейкі. Матэрыялы другога альбома расказваюць аб аднавяскоўцах. Сярод гэтых людзей былы настаўнік Раўкуцьевіцкай сярэдняй школы В. Грудзінін, былы каваль саўгаса «Савецкі» М. Стасевіч і іншыя.

Аматары мастацтва змогуць даведацца аб галоўных падзеях культурнага жыцця краіны, пазнаёміўшыся з выстаўкай «У святле фарбаў, мелодый, слова». Яе экспанаты расказваюць аб нашым сябры — музыцы, аб мастаках, іх работах, аб апошніх навінках з паэтычнага жыцця, аб майстрах тэатра і кіно.

Аб тым, як напружана працуюць рабочыя саўгаса «Савецкі», аб поспехах і дасягненнях гаспадаркі наведвальнікі даведваюцца з календара працоўнай славы, у якім штомесячна змяшчаюцца імёны перадавікоў. Так, у мінулым месяцы старонку календара ўпрыгожвалі імёны даярак малочнатаварнай фермы «Каменец» — Т. Варап і Я. Кугляк, якія закончылі першае паўгоддзе 1983 года з добрымі вынікамі. Першая надаіла ад кожнай каровы 1649 кілаграмаў пры плане 1559 кілаграмаў, другая — 1646 пры плане 1587 кілаграмаў малака.

Усю гэтую работу праводзіць загадчыца бібліятэкі Г. П. Гаралік. Яна заўсёды ў курсе ўсіх падзей не толькі ў сваёй гаспадарцы, сельсавеце, але і ў раёне, падтрымлівае цесныя сувязі з партыйнай, прафсаюзнай, камсамольскай арганізацыямі саўгаса «Савецкі».

А. ШУЛЬГОВІЧ,
селькор.

2
«ШЛЯХ КАМУНІЗМУ»
30 ліпеня 1983 года
№ 91(6278)

І гісторыя, і сучаснасць

Шаршунская сельская бібліятэка Мінскага раёна заўсёды прыцягвае ўвагу наведвальнікаў маляўніча афармленай агітацыяй. Рэгулярна афармляюцца кніжныя выстаўкі, тэматычныя паліцы, бібліятэчныя плакаты.

Шмат матэрыялаў сабрана па гісторыі роднага краю. Многа цікавага даведаюцца чытачы ў час знаёмства з выстаўкамі: «Па Міншчыне роднай», «Беларусь партызанская», «Выстаялі і перамаглі». У асобную папку выдзелены матэрыялы аб партызанскай брыгадзе «Штурмавая», якая дзейнічала ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў нашым раёне. Аб подзвігу аднавяскоўцаў можна даведацца з кніг Р. Мачульскага «Старонкі неўміручасці», «Гавораць загінуўшыя воіны».

Для тых, хто любіць мастацтва, у бібліятэцы афармлена выстаўка «У святле фарбаў, мелодый і слова».

А вось раздзел «Саўгас «Савецкі» ў 11-й пяцігодцы». Тут сабрана ўсё, што напісана журналістамі і пісьменнікамі аб мясцовых працаўніках.

Загадчыца гэтай установы культуры — энтузіяст сваёй справы бібліятэкар Ганна Паўлаўна Гаралік. Яна заўсёды ў курсе ўсіх падзей, якія адбываюцца не толькі ў сваёй гаспадарцы, але і ў раёне.

А. ШУЛЬГОВІЧ,
загадчык Камянецкай сельскай бібліятэкі.